ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (792) ● Чацвер, 3 снежня 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

## 5 снежня— Дзень Канстытуцыі СССР




## УЛАДА НАРОДА

5 снежня—Дзень прыняцця Савецкай Канстытуцыі, свята савецкай дэмакратыі, якая азначае сапраўдную і поўную ўладу народа.

У сёлетнім годзе Дзень Савецкай Канстытуцыі мы адзначаем у перыяд падрыхтоўкі да XXIV з'езда партыі, у дні, калі партыя і ўвесь народ падводзяць вынікі стваральнай працы па выкананню гістарычных рашэнняў XXIII з'езда партыі, восьмага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі. У святле гэтых вынікаў мы яшчэ раз пераконваемся ў тым, што вялікія прынцыпы Канстытуцыі СССР няўхільна рэалізуюцца ў нашым жыцці. У гэтым мы бачым яшчэ адзін доказ асноўнай перавагі савецкай дэмакратыі, пры якой, як указваў У. І. Ленін, закон і рэчаіснасць сходзяцца. Усе абвешчаныя ў Асноўным Законе правы і свабоды грамадзян забяспечаны як матэрыяльнымі, так і палітычнымі гарантыямі.

Непарушныя эканамічныя і палітычныя асновы Савецкай дзяржавы гарантуюць роўнасць грамадзян незалежна ад нацыянальнасці і полу ва ўсіх галінах палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця.

Сацыялістычная дэмакратыя забяспечвае самы шырокі ўдзел мільёнаў савецкіх людзей у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі. Савецкае выбарчае права, якое не ведае якіх-небудзь абмежаванняў, стварае рэальныя магчымасці для ўдзелу ўсіх грамадзян у фарміраванні органаў дзяржаўнай улады.

Савецкія людзі шырока выкарыстоўваюць свае выбарчыя правы. Так, у выбарах Вярхоўнага Савета восьмага склікання, якія адбыліся ў чэрвені 1970 года, прынялі ўдзел больш 153 мільёнаў чалавек, або 99,96 працэнта ўсіх выбаршчыкаў.

Сапраўды прадстаўнічы характар нашых органаў дзяржаўнай улады яскрава выражан у іх саставе. Так, у мясцовых Саветах, выбраных у 1969 годзе, жанчыны складаюць 44,6 працэнта, рабочыя — 35 працэнтаў, калгаснікі — 29,3 працэнта. Сярод дэпутатаў Саветаў —прадстаўнікі розных прафесій. Шырока прадстаўлены ў мясцовых Саветах грамадзяне ўсіх узроставых катэгорый. Моладзь склала ў Саветах 23,8 працэнта, камсамольцы — 12,7 працэнта.

Настолькі ж прадстаўнічы састаў і Вярхоўных Саветаў СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік. У адрозненне ад буржуазных краін у нас выбары праводзяць самі працоўныя. Аб гэтым пераканаўча сведчаць наступныя лічбы. У 2.155 тысячах выбраных камісій, якія былі створаны ў час выбарнай кампаніі 1969 года, працавалі 8.698 тысяч чалавек. Сярод іх 33 працэнты камуністаў, 67 працэнтаў беспартыйных, 44,7 працэнта жанчын. У камісіях удзельнічалі 870 тысяч камсамольцаў, што на 100 тысяч больш, чым у папярэдніх выбарах.

Саветы дэпутатаў працоўных з'яўляюцца ўвасабленнем сапраўднага дэмакратызму Савецкай дзяржавы. Уваходзячыя ў іх састаў больш 2 мільёнаў дэпутатаў выконваюць вялікую па сваей важнасці работу. У прынятых у апошнія гады партыяй пастановах па пытаннях савецкага будаўніцтва намечаны важнейшыя шляхі ўзмацнення актыўнасці дэпутатаў, павышэння ролі Саветаў у гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

Рэалізацыя гэтых мер станоўча адбілася на дзейнасці Саветаў. Значна актывізавалася і работа ў Вярхоўных Саветах. У апошнія гады распрацаваны і прыняты важныя заканадаўчыя акты аб ахове здароўя, працы, шлюбе і сям'і, землекарыстанні, далейшым удасканаленні пенсіннага забеспячэння і шэраг іншых. Загадзя праекты многіх актаў шырока абмяркоўваліся на сходах працоўных, у перыядычным друку. Найбольш істотныя заўвагі і папраўкі былі улічаны пры прыняцці законаў.

Далейшаму павышэнню ролі прадстаўнічых органаў садзейнічала пашырэнне іх праў у гаспадарчых, фінансавых, зямельных і іншых пытаннях.

Сацыялістычная дэмакратыя — гэта не толькі вялікія правы, прадастаўленыя савецкім грамадзянам, але і высокія абавязкі. Кожны савецкі грамадзянін павінен прытрымлівацца законаў, дысцыпліны працы, сумленна адносіцца да грамадскага доўгу, паважаць правілы сацыялістычнага супольнага жыцця, берагчы сацыялістычную уласнасць. Гэтыя патрабаванні набываюць асаблівае значэнне ў сучасных умовах.

Савецкі народ пад кіраўніцтвам КПСС поўны рашучасці і надалей самаахвярна змагацца за перамогу ідэалаў камунізма.

**А. ЛЕЙЗЕРАЎ,**
**дацэнт юрфака.**

## ВЕСТКІ З МАТФАКА

*✦ Як рыхтавацца да сесіі, на што звяртаць галоўную ўвагу пры самападрыхтоўцы і што гэта такое ўвогуле сесія, расказалі студэнтам І курса І патока студэнты-выдатнікі III курса З. Яфіменка, С. Гардзяевіч, Н. Уляцёнак і Я. Кац.*

✦ У панядзелак на матэматычным факультэце адбылося пасяджэнне камітэта камсамола з наступнай павесткай дня:

1. Падрыхтоўка да зімовай сесіі.
2. Выкананне пастановы аб рабоце ў інтэрнаце № 6.
3. Шэфская работа.

Аб падрыхтоўцы студэнтаў да сесіі расказаў адказны за акадэмічны сектар В. Балашчанка.

У першай палове снежня ў кожнай групе намечана правесці сходы сумесна са старшакурснікамі.

## ВЕСТКІ З МАТФАКА

**У мінулую суботу ў актавай зале універсітэта адбыўся злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Ужо па красамоўных назвах «Сігма» і «Амега», «Градыент» і «Эвальвента»... можна было здагадацца, што на гэты раз сабраліся матэматыкі.**

**За перыяд працоўнага семестра шэсць будаўнічых атрадаў факультэтаў матэматыкі і прыкладной матэматыкі працавалі ў Мінскай вобласці, будавалі школы, сховішчы для гародніны, кароўнікі і г. д. Сярод іх быў і атрад з паэтычнай назвай «Лотас». Лотас егіпцяне лічылі сімвалам сонца: разам з дзённым святлам раскрываліся і закрываліся яго пялёсткі. Золкім ранкам прасыналіся і байцы атрада «Лотас», а пасля работы дапазна праводзілі рэпетыцыі, рыхтавалі лекцыі для калгаснікаў.**

**Агульны вынік працоўнага семестра ў атрадах, якія працавалі ў Мінскай вобласці: асвоена каля 200 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, арганізавана каля 50 канцэртаў і лекцый, наладжаны кансультацыйныя пункты для паступаючых у ВНУ і тэхнікумы, праведзена мноства спартыўных сустрэч з мясцовымі камандамі, пабудаваны пры школах спартыўныя пляцоўкі і многае іншае. Пры атрадзе «Амега» дзейнічаў піянерскі лагер-спадарожнік.**

**Будаўнічы атрад «Градыент» (камандзір І. Пыско), як і аб'яднаны атрад «Вікторыя», працаваў на цаліне. Байцы гэтага калектыву на грамадскіх асновах дапамаглі адрамантаваць школу-інтэрнат, абсталявалі піянерскі пакой, перадалі школьнай бібліятэцы многа кніг, шэфствавалі над піянерамі.**

**Але самы важкі ўклад студэнтаў-матэматыкаў — асваенне 600 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.**

**Свае ўражанні аб працоўным летнім семестры выступіўшыя на злёце камандзіры атрадаў выказалі так:**

**— Пабывайце ў будаўнічым атрадзе. Вы з'ясце там пуд солі, пазнаеце людзей, якія вучацца з вамі, праверыце сябе.**

**— Прывезлі многа ўражанняў. Ці былі цяжкасці? Яны былі і будуць заўсёды.**

**— Усё было неяк незвычайна. Самі рабілі печку. Спачатку абедалі на зямлі, пасля зрабілі сталы.**

**— Даведаліся, што такое самастойнае жыццё.**

**— Сапраўдную рамантыку можна адчуць толькі на студэнцкай будоўлі!**

**— Не задумвайцеся, уключайцеся ў будаўнічыя атрады — гэта самая сапраўдная школа працы.**

**Н. МАРАДУДЗІНА.**

## МОВАЙ ДРУЖБЫ

— Студэнты прыйшлі! — паведамляе хтосьці, і вось ужо ўсе погляды накіраваны на дзверы. У прасторную залу Палаца культуры Мінскага камвольнага камбіната ўваходзяць в'етнамскія юнакі і дзяўчаты, студэнты БДУ. Насустрач ужо спяшаюцца гаспадары Палаца — камвольшчыкі.

— Нгуен! Ты чаму ў суботу не прыйшоў?—дапытваецца светлавалосы юнак.

— Ой, Тхань, як ты сёння прыбрана!— захапляюцца дзяўчаты.

Сябры з гераічнага В'етнама адчуваюць цёплую атмасферу ў зале. Яны ўсміхаюцца ў адказ на прывітанні маладых рабочых, ажыўлена перагаворваюцца.

Сёння яны госці на вечары, прысвечаным закрыццю тыдня савецка-в'етнамскай дружбы. На працягу пяці дзён в'етнамскія студэнты часта бывалі на камбінаце, бачылі, як працуе і адпачывае моладзь, сустракаліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны А. І. Ільіной, Г. К. Крыловым і іншымі. У гэтыя дні камітэт камсамола прадпрыемства і камітэт саюза працоўнай моладзі Хо Шы Міна абмяняліся вопытам работы, а прэзідэнт гарадскога зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў Нгуен Хуанг Мінь быў госцем адміністрацыі камбіната.

Цікава прайшлі спартыўныя спаборніцтвы. Сустрэчу па валейболу выйграла каманда камбіната, а вось сярод тэнісістаў мацнейшымі аказаліся в'етнамскія студэнты. У Палацы в'етнамскія сябры пазнаёміліся з работай секцый, народнага універсітэта, тэатра.

— Гэты тыдзень, — сказаў на вечары намеснік прэзідэнта зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў БДУ До Ван Ан,—садзейнічаў далейшаму развіццю сяброўскіх адносін паміж дзвюма арганізацыямі, якія з'яўляюцца ўвасабленнем вялікай дружбы нашых народаў.

На вечары в'етнамскім студэнтам былі ўручаны прывітальны адрас і Ганаровая грамата абкома камсамола за актыўны ўдзел у працоўным семестры. Перад гасцямі з вялікім канцэртам выступіў аркестр МКК «Шпакі». Паказала сваё мастацтва і в'етнамская моладзь.

*Ф. ФЯСЬКО, студэнтка.*



*Ідуць практычныя заняткі па матаналізу ў студэнтаў в'етнамскай групы першага курса фізічнага факультэта. Вядзе іх старшы выкладчык Валянціна Сцяпанаўна ГАХАВА.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

# БЫЦЬ У АВАНГАРДЗЕ —

## ● НА ПЯРЭДНІМ КРАІ НАВУКІ І ГРАМАДСКАГА ЖЫЦЦЯ ● ІНІЦЫЯТЫВА І ДЗЕЛАВІТАСЦЬ — СКЛАДАЕМЫЯ ПОСПЕХУ. ● СЁННЯШНІ КЛОПАТ — ЧАЛАВЕК, СПЕЦЫЯЛІСТ, ВУЧОНЫ

СПРАВАЗДАЧНЫ год азнаменаваўся падзеямі вялікага гістарычнага значэння ў жыцці савецкага народа. Найбольш важныя з іх: святкаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, 25-й гадавіны нашай перамогі над германскім фашызмам, 53-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Праведзеная парткомам, рэктаратам, партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі універсітэта работа ў сувязі са святкаваннем гэтых знамянальных дат, а таксама выбарамі ў Вярхоўны Савет СССР і іншымі буйнейшымі палітычнымі мерапрыемствамі садзейнічала далейшаму павышэнню згуртаванасці камуністаў і ўсяго калектыву універсітэта вакол Цэнтральнага Камітэта нашай партыі, паказала непарушнае жаданне настойліва змагацца за ажыццяўленне вялікіх ленінскіх ідэй, забяспечыла далейшае павышэнне ролі універсітэта ў грамадскім і навуковым жыцці рэспублікі.

Вучонымі і студэнтамі універсітэта прачытана для насельніцтва 3 тысячы лекцый і дакладаў, праведзена 36 навукова-тэарэтычных канферэнцый, 65 дыспутаў, апублікаван шэраг навуковых прац. За актыўную прапаганду вялікай ленінскай спадчыны прэзідыум Беларускага таварыства «Веды» прысудзіў універсітэту дыплом першай ступені і першую прэмію.

У гэты юбілейны год прафесарска-выкладчыцкі састаў трымаў больш цесную сувязь са школамі, дапамагаў у правядзенні канферэнцый настаўнікаў, семінараў, у падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбна-метадычных і наглядных дапаможнікаў, у абсталяванні кабінетаў, музеяў і піянерскіх пакояў.

За актыўны ўдзел у гэтай рабоце Рэспубліканскі камітэт прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў узнагародзіў ганаровымі граматамі 25 чалавек; 9 першых месц і ганаровых грамат атрымаў наш калектыў за іншыя паказчыкі.

Лепшых вынікаў у грамадскім аглядзе па культуры вытворчасці і ахове працы дабіліся геаграфічны, гістарычны, юрыдычны, біялагічны і філалагічны факультэты, кафедра гісторыі партыі гуманітарных факультэтаў. Усе яны ўзнагароджаны ганаровымі граматамі або вымпеламі, каштоўнымі падарункамі. Акрамя гэтага, за добрыя паказчыкі ў рабоце ўзнагароджаны ганаровымі граматамі калектывы 10 кафедр, 4 аддзелаў, 3 інтэрнатаў і вучэбных карпусоў, 9 вучэбных груп, 57 выкладчыкаў. Добра быў праведзен суботнік, у якім прыняло ўдзел 12 тысяч чалавек.

У цэлым за добрую работу і ў азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна рэктаратам, парткомам і мясцкомам 380 чалавек узнагароджаны граматамі, 411 чалавек прэміраваны, 248 чалавек узнагароджаны юбілейным медалем «За доблесную працу».

Камсамольская арганізацыя БДУ ўзнагароджана Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

За дасягненне высокіх паказчыкаў у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна ЦК КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, Савет Міністраў СССР і ВЦСПС узнагародзілі наш універсітэт Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай. Гэта ацэнка работы калектыву універсітэта абавязвае нас дабівацца далейшых поспехаў.

Выбраны 30 лістапада 1969 г. састаў парткома ў колькасці 21 чалавека распрацаваў план арганізацыйна-партыйнай і ідэалагічнай работы і практычна забяспечваў яго выкананне. Пры парткоме было створана 10 сектараў па канкрэтных пытаннях арганізацыйна-партыйнай і ідэалагічнай работы, узначальваемыя членамі парткома. Усе яны, шырока прыцягваючы партыйны актыў, праводзілі вялікую работу па выкананню намечаных мерапрыемстваў.

Партком увёў новую форму работы — правядзенне сходаў і нарад партыйнага актыву па карэнных і прынцыповых пытаннях.

У справаздачным перыядзе адбыліся два сходы і адна нарада партыйнага актыву. Першы— па пытанні «Ленінскі стыль у рабоце і задачы партыйнага актыву». Другі быў прысвечан падрыхтоўцы да новага навучальнага года.

Шырокая нарада намеціла задачы па дастойнай сустрэчы XXIV з'езда нашай партыі. Пасля гэтай нарады ва ўсіх партыйных арганізацыях былі складзены планы, праведзены партсходы, пасяджэнні вучоных саветаў, кафедр з гэтай павесткай дня. Акрамя гэтага, за справаздачны перыяд былі праведзены два агульнауніверсітэцкія партыйныя сходы.

У сваёй практычнай дзейнасці партком вялікую ўвагу ўдзяляў паляпшэнню арганізатарскай работы факультэтаў, кафедр, грамадскіх арганізацый. Галоўнае, на чым была сканцэнтравана ўвага, — выхаванне дзелавітасці, якая выяўляецца ў акуратнасці, дакладнасці ў рабоце, уменні цаніць фактар часу. Мы імкнуліся ліквідаваць залішнюю засядацельскую мітусню, забяспечыць больш арганізаванае правядзенне сходаў, пасяджэнняў, нарад, скарачаючы час на іх правядзенне лепшай іх падрыхтоўкай. У выніку сходы, пасяджэнні сталі лепш рыхтавацца і праводзіцца больш арганізавана. Па-другое, наша задача заключалася ў тым, каб навучыць нашы кадры пры рашэнні канкрэтных задач аб'ядноўваць намаганні ўсіх арганізацый, накіроўваць іх у патрэбным напрамку. Гэта таксама прывяло да станоўчых вынікаў. Ва ўзаемадзеянні рэктарата, парткома, дэканатаў, кафедр, партыйных бюро, мясцкома, прафкома, камітэта камсамола, служб і аддзелаў заўважаецца дзелавая ініцыятыва ў пастаноўцы і сумесным рашэнні пытанняў.

Па-трэцяе, мы ўзмацнілі кантроль па праверцы выканання дырэктыў, загадаў, рашэнняў, павысілі дысцыпліну сярод абслугоўваючага персаналу, падверглі вострай крытыцы на сходах партактыву факты невыканальнасці.

Прынятыя меры станоўча адбіліся на паляпшэнні работы партыйных і грамадскіх арганізацый, дэканатаў, аддзелаў і служб, кафедр. Паказальным прыкладам служыць юрыдычны факультэт (сакратар партбюро С. Р. Драбязка, дэкан В. А. Шкурко). У мінулым, на нашых сходах, пасяджэннях падвяргаўся крытыцы юрыдычны факультэт за недахопы ў выхаваўчай рабоце, за дрэннае становішча спраў у інтэрнатах. У выніку прынятых мер становішча змянілася. Цяпер тут высокая паспяховасць, добра пастаўлена навуковая работа, палепшылася дысцыпліна.

Ва універсітэце 15 партыйных арганізацый, якія аб'ядноўваюць 929 камуністаў. Ва ўсіх партарганізацыях універсітэта партыйныя сходы праводзіліся рэгулярна, разглядаліся і рашаліся найбольш важныя пытанні жыцця і дзейнасці партыйных арганізацый, развіцця навукі, ідэалагічнай работы, вучэбнага працэсу, работы грамадскіх арганізацый і іншыя.

У партарганізацыях існуе добрая практыка, калі бюро перыядычна інфармуе камуністаў на сходах аб сваёй рабоце. Рэгулярна заслухоўваюцца паведамленні членаў і кандыдатаў у члены партыі аб выкананні патрабаванняў Праграмы і Статута КПСС. Усё гэта павышае актыўнасць і адказнасць камуністаў, станоўча ўплывае на дзейнасць партыйных арганізацый.

Вялікае месца ў рабоце парткома занялі справаздачна-выбарныя партыйныя сходы, праведзеныя ва ўсіх партарганізацыях у маі—чэрвені гэтага года. Новаму саставу парткома неабходна далей падымаць значэнне партыйных сходаў як вышэйшага органа партыйнай арганізацыі, рабіць усё для таго, каб яны аказвалі рашаючае ўздзеянне на далейшае развіццё ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, умацаванне ленінскага прынцыпу калектыўнасці ў працы.

Вялікую ўвагу партком удзяляў рабоце партыйных груп. Іх у нас 29, 14 — у вучэбных групах. Партыйныя групы аказваюць вялікі ўплыў на фарміраванне ў студэнтаў марксісцка-ленінскага светапогляду, выхоўваюць іх у духу высокай партыйнай прынцыповасці.

За справаздачны перыяд праведзена 23 пасяджэнні парткома, на якіх было разгледжана 50 пытанняў унутрыпартыйнага жыцця, ідэалагічнай, навуковай, камсамольскай работы, навучальнага працэсу і г. д.

АСНОЎНЫ змест прымаемых рашэнняў і ўся практычная работа парткома былі накіраваны на далейшае павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Рашэнню гэтай праблемы садзейнічала паляпшэнне ідэйнага выхавання студэнцтва, фарміраванне асобы сацыяльна актыўнай, творчай, усведамляючай свой доўг, сваё месца ў барацьбе за ажыццяўленне камуністычных ідэалаў.

Асноўным прынцыпам, па якому наладжвалася дзейнасць парткома, партыйных і грамадскіх арганізацый па камуністычнаму выхаванню, з'яўлялася адзінства вучэбнай, навуковай, грамадскай і выхаваўчай работы, пераемнасць і паслядоўнасць усіх этапаў навучання і выхавання, каардынацыя намаганняў усіх звенняў, якія ўдзельнічалі ў выхаваўчым працэсе. Мы ўлічвалі, што камуністычнае выхаванне на кожным этапе навучання мае свае асаблівасці, і з першых жа месяцаў знаходжання чалавека ў вну развівалі ў яго пачуццё глыбокай асабістай адказнасці за якасць ведаў, разуменне таго, што вучоба — гэта няспынная праца, вучылі працаваць настойліва, творча.

Асноўную ролю ў камуністычным выхаванні выконвалі кафедры грамадскіх навук. Пытанне аб паляпшэнні работы кафедр грамадскіх навук абмяркоўвалася на пасяджэнні парткома.

З мэтай удасканалення гэтай работы партком асобую ўвагу ўдзяляў аператыўнаму абмеркаванню на ўсіх кафедрах важнейшых рашэнняў партыі і ўрада, ходу выканання пяцігадовага плана выхаваўчай работы.

Вялікае месца займала арганізацыя работы са студэнтамі ў пазавучэбны час. Праводзіліся сходы студэнтаў па розных пытаннях на курсах і ў групах, злёт выдатнікаў вучобы, арганізацыя лекцый і дакладаў, дыспутаў, канферэнцый чытачоў, вечароў, сустрэч. За гэты год праведзена 35 тэматычных вечароў, на якіх прысутнічала больш 7 тысяч студэнтаў, прачытана больш 350 лекцый, дакладаў, адбылося 5 вечароў дружбы з замежнымі студэнтамі.

Многа універсітэцкай моладзі ўдзельнічала ў экскурсіях, паходах па месцах баявой славы, у розных конкурсах, у СНТ, у шэфскай рабоце і мастацкай самадзейнасці, у спартыўных спаборніцтвах, масавых кросах, лыжных паходах і г. д.

Важнае месца заняла работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Было арганізавана 18 выездаў па памятных месцах, да помнікаў загінуўшым воінам і партызанам, у крэпасць-герой Брэст, у Хатынь.

Праведзен тыдзень памяці герояў. У кожнай вучэбнай групе выступалі актыўныя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, Героі Савецкага Саюза — удзельнікі штурма Берліна.

У 80 вучэбных групах праведзены канферэнцыі чытачоў «Вобраз савецкага воіна ў мастацкай літаратуры», «Беларусь — краіна партызанская», два кінафестывалі ваенна - патрыятычных фільмаў.

Ваенны савет ЧБВА за высокія паказчыкі ў рабоце ўзнагародзіў калектыў ваеннай кафедры Юбілейнай Граматай у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

З мэтай далейшага паляпшэння ваенна-патрыятычнага выхавання і абаронна-масавай работы, дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС калектыў універсітэта ўключыўся ў рэспубліканскі агляд-конкурс абаронна-масавай работы.

Вялікая ўвага ўдзялялася правядзенню палітінфармацый.

Другім напрамкам работы парткома і партарганізацыі па павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўлялася паляпшэнне работы з кадрамі прафесарска-выкладчыцкага і дапаможнага саставу: арганізацыя партыйнай асветы, паляпшэнне метадычнай работы, павышэнне навуковай падрыхтоўкі кадраў. Ва універсітэце арганізаваны і працуюць 27 семінараў па важнейшых праблемах тэорыі марксізма-ленінізма, 4 школы асноў марксізма-ленінізма і 15 пачатковых школ, у якіх вучыцца больш 2 тысяч чалавек.

Больш 150 нашых камуністаў працуюць прапагандыстамі ў г. Мінску.

Метадычная работа ў асноўным арганізуецца і праводзіцца на кафедрах. Павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў садзейнічала таксама паляпшэнне вытворчай практыкі і адбору новага папаўнення, пашырэнне навуковых даследаванняў.

Пытанні навукі тройчы ставіліся на пасяджэннях парткома, рэгулярна абмяркоўваліся на партбюро і партсходах, пасяджэннях вучэбных саветаў і кафедр. Прынятыя меры забяспечылі ў асноўным выкананне плана НДР, адбылася прыкметная канцэнтрацыя сіл у рашэнні навуковых праблем Прывяду некалькі даных. У 1970 г. выдадзена 68 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, вядуцца работы па 134 тэмах саюзнага і рэспубліканскага значэння. Аўтарскі калектыў дзвюх кафедр гісторыі партыі падрыхтаваў і выдаў упершыню ў рэспубліцы курс лекцый па гісторыі партыі.

Больш актыўна сталі ўдзельнічаць у навуковай рабоце студэнты. Усяго ва універсітэце працуе 72 студэнцкія гурткі, у якіх займаюцца 2.560 чалавек.

Важнейшым напрамкам павышэння паспяховасці студэнтаў з'яўлялася паляпшэнне матэрыяльна-вучэбнай базы, умоў вучобы, быту і адпачынку.

У СВАЁЙ практычнай дзейнасці партком вялікую ўвагу ўдзяляў кіраўніцтву грамадскімі арганізацыямі. Пытанні работы прафсаюза, камсамола, таварыства «Веды», ДТСААФ абмяркоўваліся на пасяджэннях парткома, разгледжаны таксама і планы работы ўсіх грамадскіх арганізацый, рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт».

У выніку прынятых мер наш мясцком і прафком палепшылі арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва, сталі больш праяўляць клопатаў аб паляпшэнні матэрыяльнага забеспячэння вучэбнага працэсу, аб культуры і ахове працы, грамадскім харчаванні.

Ва універсітэце ёсць 86 курсавых і паточных пярвічных камсамольскіх арганізацый, 321 камсамольская група, якія аб'ядноўваюць 9.512 камсамольцаў. Камітэт камсамола універсітэта працуе на правах райкома камсамола.

Галоўную ўвагу партком удзяляў паляпшэнню унутрысаюзнай работы ў камсамоле. З гэтай мэтай было праведзена тры сходы камсамольскага актыву па такіх пытаннях: «Аб мерах па паляпшэнню арганізатарскай работы камсамольскіх органаў», «Аб ваенна-патрыятычным выхаванні камсамольцаў», «Аб рабоце ў інтэрнатах».

Нядрэнна арганізавана вучоба камсамольскага актыву па практыцы камсамольскай работы.

З мэтай аказання дапамогі ў паляпшэнні унутрысаюзнай работы партком двойчы пасылаў партыйны актыў у вучэбныя групы для падрыхтоўкі і правядзення камсамольскіх сходаў.

Партком і партыйныя бюро актыўна і шырока прыцягвалі камсамольцаў да правядзення ўсіх палітычных мерапрыемстваў. Трэба адзначыць, што камітэт камсамола, камсамольскія бюро факультэтаў на справе з'яўляюцца самымі актыўнымі нашымі памочнікамі, у правядзенні вечароў, дэманстрацый, мітынгаў, лекцый.

ДАКЛАДВАЮЧЫ аб асноўных прынцыповых пытаннях работы парткома, мы павінны сказаць і аб наяўнасці недахопаў. Галоўны з іх у тым, што мы яшчэ не дайшлі да кожнага студэнта, не прынялі дзейсных мер да паляпшэння індывідуальнай выхаваўчай работы.

Партком слаба клапаціўся аб згуртаванні студэнцкай групы, аб паляпшэнні работы з куратарамі, павышэнні не толькі патрабавальнасці да іх, але і зацікаўленасці да іх патрэб. У выніку гэтага не ўсюды вучэбная група выконвае функцыю калектыўнага выхавацеля і не заўсёды з'яўляецца цэнтрам палітычнай работы. Галоўная наша бяда ў тым, што некаторая частка студэнтаў вядзе сябе дрэнна, нездавальняюча адносіцца да вучобы, сацыялістычнай уласнасці і правіл паводзін, не праяўляе сябе ў грамадскай рабоце. З 8 тысяч студэнтаў, якія здалі вясной экзамены, 275, або 3,4 працэнта па ўсіх прадметах атрымалі толькі тройкі, з іх першакурснікі—175 чалавек. Многія студэнты маюць нездавальняючыя адзнакі.

За 1969-70 вучэбны год з універсітэта адлічана 379 студэнтаў: па асабістых просьбах і ў сувязі з пераводам у другія вну — 199 чалавек; за непаспяховасць — 169 чалавек; за амаральныя паводзіны — 11 чалавек.

Многа выключаем мы за непаспяховасць. Гэта брак нашай работы па набору, навучанню і выхаванню. Навучанне кожнага студэнта ў год у сярэднім каштуе 900 рублёў. Калі перавесці на грошы, то брак складае да 200 тыс. рублёў.

У інтэрнатах у нас жыве 50 працэнтаў іншагародніх студэнтаў. Асноўная маса, усведамляючы свой грамадскі доўг, добра выконвае унутраны распарадак і правілы сацыялістычнага супольнага жыцця. Але ёсць і такія, якія дрэнна адносяцца да сацыялістычнай маёмасці, груба парушаюць дысцыпліну.

У 1970 годзе за парушэнне правіл унутранага распарадку 80 студэнтаў былі выселены з інтэрнатаў.

Выклікаюць сур'ёзны непакой пропускі заняткаў. Так, толькі за другі семестр мінулага навучальнага года студэнтамі без уважлівых прычын прапушчана 32 тысячы гадзін, або 3 працэнты ўсіх заняткаў, а на філфаку 5 працэнтаў, у сярэднім па 40 гадзін на кожнага студэнта, прычым галоўным чынам тымі студэнтамі, якія вучацца пасрэдна. Можна сказаць, што гэта вынік абыякавасці не толькі некаторых выкладчыкаў, але і асобных камуністаў.

Ёсць істотныя недахопы і ў правядзенні вытворчай практыкі. Некаторыя кіраўнікі практыкі рэдка бываюць самі на прадпрыемствах, ва ўстановах і слаба выконваюць абавязкі па кіраўніцтву практыкай. Не ўсе студэнты ўключаюцца ў актыўную грамадскую работу, якая праводзіцца на прадпрыемствах, ва ўстановах, школах у час практыкі. Не зжыты яшчэ выпадкі парушэння дысцыпліны, прагулы, самавольныя скарачэнні тэрмі-

> **На 11 факультэтах, 88 кафедрах, у 11 праблемных лабараторыях універсітэта працуе і вучыцца 20.421 чалавек, у тым ліку студэнтаў: 9.137—на стацыянары, 3.120—на вячэрнім і 4.585—на завочным аддзяленнях, 282—на курсах павышэння кваліфікацыі; працуе 2.805 чалавек, з іх 1.415—прафесарска-выкладчыцкага саставу, навуковых і інжынерна-тэхнічных работнікаў і 1.400—вучэбна-дапаможнага саставу.**




І вось адбылася фінальная сустрэча, сустрэча самых вясёлых, знаходлівых і дасціпных — журналістау і хімікау. Якой камандзе дастанецца «Гран-Пры» — крыштальная ваза? Менавіта гэтае пытанне не давала спакою як камандам, так і балельшчыкам. Самымі спакойнымі і урауназажанымі у зале былі суддзі. Але і ім таксама прадстаяла перанесціся у незвычайны, чароуны свет, бо сустрэча вясёлых і знаходлівых была казачнай.

...Занавес рассоуваецца. На сцэне велізарны Змей Гарыныч. Сёння гэта не злосны казачны персанаж, а дабрадушны і вясёлы Гаруша, які шчыра вітае балельшчыкау, «пагражае» сапернікам. Ён адразу увёу прысутных у казку КВЗ, задау правільны тон сустрэчы.

Прывітанне каманды хімфака таксама было казачным. Казка гэта — баявая, гераічная. Апавядае яе легендарны Хлапчыш-Кібальчыш. І так цікава хімікі здолелі расказаць яе, што пакарылі балельшчыкау, членау журы і атрымалі найбольшую колькасць балау.

Традыцыйная разминка каманд таксама не прынесла поспеху журналістам. Відавочнай была іх вяласць, нейкая разгубленасць. Такі настрой перадауся і балельшчыкам, і гэта у той час, калі сканцэнтраваныя, напорыстыя, непасрэдныя хімікі упэунена крочылі да перамогі.

Далей на сцэне разгортваюцца цікавыя конкурсы і імправізацыі. Але усё гэта яшчэ прыказка. Сапрауднай жа казкай аказалася дамашняе заданне журналістау.

...Студэнт - першакурснік трапляе на Алімп. Туды, «да усіх багоу», адправіу яго патрабавальны рэдактар. Увазе гледачоу было прадстаулена цудоунае тэатралізаванае відовішча Алімпа з усімі яго жыхарамі, дзе грозны Зеус павучау студэнта:

— Толькі тады ты станеш сапраудным журналістам, калі будзеш ведаць замежныя мовы так, як кур'ер мой Меркурый, будзеш стойкім, як Марс, калі навучышся развязваць языкі людзям, як Бахус, і калі будзеш такім чароуным, як Венера.

Дарэчы, Венера і сапрауды была чароунай. Аляксандр Дамарацкі так увайшоу у ролю, што заваявау сімпатыі усіх прысутных.

Дзякуючы тонкаму гумару, трапнай, дасціпнай сатыры камандзе журфака удалося звязаць казачнасць з надзённымі клопатамі, высмеяць некаторыя хібы і... пакінуць далёка ззаду па колькасці ачкоу каманду хімікау. Гэта і вырашыла вынік сустрэчы. З лікам 41:37 каманды закончылі свой паядынак.

Пад гучныя авацыі балельшчыкау каманда факультэта журналістыкі пакідала залу. У руках капітана Мішы Каломенскага зіхацела крыштальная ваза.

С. МІШУХІН.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.





НА ЗДЫМКАХ: (справа) перад мікрафонам прадстаунік прэсцэнтра каманды хімфака Г. Кажушкоу; (унізе) на Алімпе—«багі»-журналісты.



## АДКАЗВАЮЦЬ БАЛЕЛЬШЧЫКІ

**— Ваша думка аб КВЗ!**

Генадзь БУБЛІК, лабарант кафедры нафтахіміі (паклоннік сваей каманды):

— КВЗ — вясёлае інтэлектуальнае мерапрыемства. Яму, як кажуць, усе узросты падуладны. Фінал быу цікавым, але не абышлося і без недахопау: па-першае, было мала музыкі, па-другое, у многіх сцэнах не хапала жывасці.

Н. Г. БУДАНАС, выкладчыца іспанскай мовы (паклонніца каманды журналістау):

— КВЗ цікавы тым, што прымушае думаць хутка і самастойна.

**— Што Вы можаце сказаць аб камандзе, за якую не балелі!**

Г. БУБЛІК:

— Вельмі добра падрыхтавалі журналісты дамашняе заданне. Ад прэсцэнтра можна было чакаць большага. Капітану каманды не хапала жывасці, энергічнасці.

Н. Г. БУДАНАС:

— Спадабалася у хімікау іх непасрэднасць, не спадабалася — нядобразычлівасць у адносінах да праціуніка.



Адзін з конкурсау. Баксёры друкуюць на машынках.

## КАМЕНЦІРУЮЦЬ ПРЭСЦЭНТРЫ

*ХІМІКАЎ: — Нам было прыемна сустрэцца з журналістамі на журналісцкай ніве.*

*ЖУРНАЛІСТАЎ: — Адзінае, што нам перашкаджала, — гэта каманды.*



РЭДАКТАР: — Толькі тады ты станеш сапраудным журналістам, калі будзеш ведаць замежныя мовы...



# ЗАПРАШАЕ «КРЫЖАЧОК»

Праўленне студэнцкага клуба БДУ імя У. І. Леніна ў сувязі з падрыхтоўкай да 50-годдзя нашага універсітэта аб'яўляе набор у **народны ансамбль танца «Крыжачок».**

Запіс у калектывы мастацкай самадзейнасці праводзіцца ў прафкоме (галоўны корпус, пакой 205) штодзённа.

**ПРАЎЛЕННЕ КЛУБА.**



## АЦЭНЬВАЮЦЬ СУДДЗІ

**— Якое ўражанне аказаў на Вас, як на члена журы, фінал КВЗ?**

А. І. РАКОВІЧ, намеснік дэкана журфака:

— Фінальная сустрэча была больш гарачай, чым тэмпература у пашчы Гарушы. На сцэне усё было добра, акрамя непаладак з мікрафонам і скаванасці вядучых. Нягледзячы на усе зрывы, сустрэча мне спадабалася. Конкурс баксёрау, мне здаецца, быу лішнім у КВЗ.

В. Ф. ЦІКАВЫ, намеснік дэкана хімфака:

— Мне падабаецца, што ў білетах гледачоў былі ўказаны месцы. Не менш спадабалася знаходлівасць балельшчыкаў, якія не мелі білетаў з месцамі. Паклоннікі абедзвюх каманд знайшлі прытулак на падаконніках і нават на падлозе. Па-мойму, у фінале сустрэліся дастойныя саперпікі. Гэта відаць было з разгарнуўшыхся на сцэне падзей: лік пераходзіў, як кажуць, з рук у рукі. Сустрэча была не менш цікавай за тэлевізійныя.

**— Што Вы скажаце аб саперніках Вашай каманды?**

А. І. РАКОВІЧ:

— Каманда хімічнага факультэта—моцны сапернік. Перашкодзіла ёй адно «але»... Адчуваецца недапрацоўка дамашняга задання. Дыялогі герояў казак ператварыліся ў маналогі.

В. Ф. ЦІКАВЫ:

— Як кажуць, пераможцаў не судзяць, і ўсё ж... У самым пачатку інтэлектуальнай разміпкі ў каманду журфака пракралася разгубленасць. Хімікі правільна адказалі на два пытанні і выйшлі наперад. Да прэсцэнтра журналісты маюць самыя прамыя адносіны. Па-мойму, гэта задача ў любым КВЗ загадзя вырашаецца з удзелам журналістаў. Але не спадабаўся мне тон паведамленняў прэсцэнтра.

**— Чаму, на Вашу думку, каманда факультэта журналістыкі «трапіла ў казку»?**

А. І. РАКОВІЧ:

— Нашы рабяты на вышыні Алімпа аказаліся пасля паказу дамашняга задання. На сцэне ўсе трымаліся свабодна, гаварылі дакладна, коратка, а галоўнае — смешна. Прэсцэнтр своечасова і востра выходзіў у эфір КВЗ.

В. Ф. ЦІКАВЫ:

— Каманда журналістаў узяла перавагу пасля конкурсу балельшчыкаў. А пасля дамашняга задання стала зусім відавочна, што пальму першынства журналісты трымаюць моцна. Хімікі тут намнога адсталі. Каб стварыць вясёлы настрой, патрэбна дынаміка, гэта значыць кароткія і ясныя пытанні і адказы. У хімікаў жа маналогі герояў казак былі зацягнуты.

## ПЫТАННІ КАПІТАНАМ

**— Як Вы ацэньваеце выступленне сваёй каманды?**
**— А каманды сапернікаў?**
**— Аб чым вы шкадуеце?**
**— Чаму радуецеся?**

Адказвае Андрэй РУДАКОЎ (хімфак):

1. Выступленне нашай каманды можна параўнаць з працай Сізіфа.
2. Яны ўзялі занадта нізкі старт, але набралі высокую скорасць.
3. Я шкадую нашых балельшчыкаў. «О, жалкий жребий их...».
4. Выхаду з залы.

Міша КАЛОМЕНСКІ (журфак):

1. Добра.
2. Некалькі горш.
3. Аб паражэнні ў размінцы.
4. Нашай перамозе.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.